Гимназии в Полесском школьном округе были лишь в Бресте (с 1924 г.) и Пинске (с 1922 г.). В 1934 г. число школ организации "Тарбут" на Полесье достигло 27. Число же детских садов и гимназий осталось прежним.

Согласно материалам, сохранившимся в госархиве Брестской области, можно проанализировать содержание учебных программ школ товарищества "Тарбут". В семиклассных школах изучались учебные дисциплины следующих циклов:

1. Религиозные предметы: религия и Библия.
2. Гуманитарные и филологические предметы (иврит, польский язык, всемирная история, история Польши, история евреев, всемирная география и география Палестины.
3. Точные науки (особое внимание уделялось изучению алгебры и геометрии).
4. Естественные науки (изучалось только природоведение).
5. Дополнительные предметы (пение, гимнастика, труд).

Программы гимназий "Тарбут" были шире программ начальных школ, но также содержали учебные дисциплины, благодаря которым учащиеся получали возможность изучать еврейские традиции, историю своего народа и родной язык, что способствовало воспитанию национальной идентичности и сохранению еврейской культуры.

## З ГІСТОРЫІ АДРАДЖЭННЯ УНІЯЦТВА НА ПАЛЕССІ Ў 1920-30-я гг.: В. АНОШКА І ЯГО РЭЛІГІЙНА- ГРАМАДСКАЯ ДЗЕЙНАСЦЬ

*А.А. Ільіна*
Навуковы кіраўнік – к.гіст.н., дацэнт ***А.М. Вабішчэвіч***
*Брэсцкі дзяржаўны універсітэт імя А.С. Пушкіна*

Падзел Беларусі ў 1921 г. перадвызначыў знаходжанне яе заходняй часткі да 1939 г. у складзе Польскай рэспублікі. У дачыненні да гэтых тэрыторыяў польскія ўлады праводзілі не толькі адпаведную эканамічную, нацыянальную палітыку, але і рабілі пэўныя крокі для кантролю рэлігійнага жыцця на "усходніх крэсах". У гэты час моцную падтрымку польскай дзяржавы атрымлівае найперш рыма-каталіцкая царква, якую актыўна выкарыстоўвалі для паланізацыі беларускага насельніцтва. Аднак з'явіўся шанец і для адраджэння уніяцкай царквы. Гарачымі прыхільнікамі адраджэння уніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі былі рыма-каталіцкія біскупы Віленскай, Пінскай і Падляскай дыяцэзіяў Юры Матулевіч, Зыгмунт Лазінскі і Генрык Пшэзьдзецкі. З іх падтрымкаю неауніяцкі рух дасягнуў пэўных поспехаў. У перыяд з 1924 г. па 1939 г. у складзе рыма-каталіцкіх дыяцэзіяў было створана каля 30 парафіяў візантыйскага абраду, колькасць вернікаў дасягала 30 тысяч. Польскія ўлады, не без падстаў баючыся пашырэння нацыянальнай свядомасці беларусаў, пачалі рабіць пэўныя перашкоды на шляху адбудавання і развіцця уніяцкай царквы. Гэта асабліва праявілася ў другой палове 1930-х гг., калі памерлі біскупы – Ю. Матулевіч і З. Лазінскі – актыўныя прыхільнікі і абаронцы уніі. У гэты перыяд не было створана ніводнай новай уніяцкай парафіі [1].

Тэме адраджэння уніі ў міжваенны час не надаецца належнай увагі з боку сучасных беларускіх даследчыкаў. А гэтая старонка нашай гісторыі каштоўна таму, што шэраг каталіцкіх святароў лацінскага і візантыйскага абрадаў прысвяцілі сябе адраджэнню уніі на тэрыторыі Заходняй Беларусі, а некаторыя з іх спрычыніліся і да справы беларускага нацыянальнага руху.

Нацыянальная свядомасць жыхароў Палесся ў міжваенны час знаходзілася ў стадыі фармавання. Тым не менш, тут працавалі выдатныя дзеячы нацыянальных рухаў, якія спрабавалі ўплываць на грамадскую думку. Зразумела, што ў асноўным грамадска-палітычнае жыццё віравала ў Вільні і Варшаве – ёй даследчыкі і аддавалі больш увагі. Але не менш цікавым было грамадскае жыццё ў правінцыі. Калі афіцыйная ідэалогія тагачаснай Польскай дзяржавы імкнулася прывесці ўсё да польскага, нават тут, на перыферыі, у нацыянальным руху адбываліся цікавыя падзеі, тут жылі выдатныя асобы. Многія з іх сёння, на жаль, малавядомыя. Вяртанне гэтых іменаў з'яўляецца вельмі актуальнай і карыснай справай як для больш поўнага разумення тагачасных працэсаў. Артыкул прысвечаны а.Вячаславу Аношку, каталіцкаму святару усходняга абраду, выдатнаму дзеячу беларускага хрысціянскага руху XX ст. Паходзіў

а. Вячаслаў Аношка з заможнай беларускай сям'і. Вучыўся ў Мінскай духоўнай каталіцкай семінарыі пасля эвакуацыі яе ў Пінск. Ёсць падставы меркаваць, што ў другой палове 1920-х гадоў а. Аношка стаў святаром грэка-каталіцкага абраду. У міжваенны час працаваў на Палессі, у душпастарскай дзейнасці асаблівую ўвагу аддаваў працы з моладзю. Выступаў за беларусізацыю нацыянальна-рэлігійнага жыцця на заходнебеларускіх абшарах. У душпастарскай працы звяртаўся на беларускай мове. Напрыканцы Другой сусветнай вайны а. Вячаслаў Аношка апынуўся ў Польшчы. Працаваў капеланам у кляштары сясцёр-манахінь "Rodziny Maryi". Памёр у 1966 годзе у Раберціне каля мясцовасці Пясечна [2].

Даследванні з большага грунтуюцца на матэрыялах Дзяржаўнага архіва Брэсцкай вобласці і ўспамінах сучаснікаў.

**Літаратура**


1. Абламейка С. Пакутніцкі шлях БГКЦ. – М., 2000.
2. Беларускія рэлігійныя дзеячы XX стагоддзя / Нав.-рэд. савет: У. Конан (адказны рэд.) і інш. – Мн.-Мюн., 1999.


## РОЛЯ МЕДЫЦЫНСКІХ ТАВАРЫСТВАЎ У ГРАМАДСКІМ ЖЫЦЦІ БЕЛАРУСІ Ў КАНЦЫ XIX СТ.


***І.У. Кабярэц***

Навуковы кіраўнік – к.гіст.н., дацэнт ***А.Г. Каханоўскі***

*Беларускі дзяржаўны універсітэт*


Праблема дзейнасці добраахвотных грамадскіх таварыстваў мае вялікую навуковую актуальнасць, бо дазваляе прасачыць станаўленне грамадскай супольнасці на Беларусі. Аднак вывучэнне гэтай тэмы не знайшло належнага месца у беларускай гістарыяграфіі. У апошнія гады навукоўцы пачалі праяўляць усё большую цікавасць да праблемы. Асобныя сюжэты дзейнасці грамадскіх арганізацый ўжо знайшлі адлюстраванне, але многія аспекты праблемы застаюцца да канца недаследваннымі.

У канцы XIX ст. ўзніклі грамадскія аб'яднанні, якія ставілі за мэту рэалізацыю ініцыятываў насельніцтва ў галіне медыцынскага абслугоўвання. Пачынаючы з 70- х гг. XIX ст. і да 1906 г. на Беларусі было створана 5 медыцынскіх арганізацый.

У ахове здароўя казённая расійская медыцына магла абслугоўваць невялікую частку насельніцтва, а медыцына прыватная была даступнай толькі заможнай частцы жыхароў. Цэнтральнае месца ў сістэме расійскай аховы здароўя паступова заняла земская медыцына, якая карысталася ў краіне высокім аўтарытэтам. З ёй цесна супрацоўнічалі грамадскія арганізацыі, якія дапаўнялі дзейнасць земстваў. На Беларусі з-за доўгатэрміновай адсутнасці земсткіх установ медыцынскія грамадскія арганізацыі вымушаны былі не дапаўняць, а замяняць земскую дзейнасць.

Вялікую ролю ў развіцці аховы здароўя адыгралі мясцовыя таварыствы ўрачоў, а ў некаторых месцах узніклі "медыцынскія таварыствы". Аднародныя па сваіх задачах пашырэння медыцынскіх ведаў і барацьбы з хваробамі яны прымалі ў свой склад не толькі ўрачоў, але і фармацэўтаў, ветэрынараў і г. д.

Дзейнасць таварыстваў урачоў, створаных у кожным губернскім горадзе ў другой палове XIX - пачатку XX ст. паступова пераходзіла ад чыста "навуковых пошукаў" да спробаў задаволіць мясцовыя патрэбы ў медыцынскім абслугоўванні, а адсюль – да больш шырокай грамадскай дзейнасці. Так, напрыклад, Таварыства мінскіх урачоў, утворанае ў 1867 г. адразу пачало іграць значную ролю у грамадскім жыцці. Яно арганізоўвала з'езды ўрачоў, на якіх апрача навуковых пытанняў, таксама разглядаліся пытанні грамадзянскай медыцыны. У сваіх рэзалюцыях удзельнікі з'езду паказвалі на недахопы тутэйшага земства, патрабавалі шырокіх сацыяльных рэформ і ў асобку адзначалі шкоду існавання "мяжы аседласці" для яўрэяў, нераўнапраўя насяляючых Беларусь нацыянальнасцяў і інш. Таварыства мінскіх ўрачоў карысталася ўсякім выпадкам, каб выказваць свой погляд аб неабходнасці грунтоўных рэформаў як палітычнага, так і сацыяльнага характару. Апрача Мінскага, у пачатку XX ст.